# Рыцар Байда
## (народная балада 16 ст.)

Музыка і словы народныя




"Ой ты Байда маладзюсенькі!
З цябе ж рыцар да слаўнюсенькі:
Будзіш панам ты гаспадарам!
Вазьмі маю дачку царэўначку!"

"Да твая ж дачка паганачка!
Яе ж вера да праклятая!..."
Крыкнуў цар тут на сваі служкі,
На сваі служкі вярнюсенькі:

"Ой вазьміце ж Байду да й звяжыце,
На гак рэбрам перачапіце!"
Вісіць Байда, ні дзень, ні два,
Ні адну ночку, ні гадзіночку...

На дзень трэці праглядае,
Свайму цюру прамаўляе:
"Ой ты цюра ты вярнюсенькі,
Падай ты лучок тугусенькі!"

Трафіў цара пасярод лаба
А царыцу у патыліцу;
"Вота ж табе турэцкаму цару
Да за слаўнага рыцара кару!

Лучшэ цар табе было галаву
Галаву с плеч Байдавых зняці;
І па Байдавай рыцара смерці
Ды з гармат ды з гармат страляці!"

© Stary Olsa